## *РЕЛИГИОВЕДЕНИЕ*

# «ESPOSITIO LIBRI BOETII DE HEBDOMADIBUS» Т.АКВІРСКАГА: ГЕРМЕНЕУТЫЧНЫ КАМЕНТАР

***І. Х. Гафараў***
***Еўрапейскі гуманітарны универсітэт***

*Expositio libri Boetii de Hebdomadibus* Тамаша Аквінскага — гэта тэкст, які каментуе *De Hebdomadibus* (*De substantiae bonae*) Баэцыя. *Expositio libri Boetii de Hebdomadibus* створаны паміж 1256 і 1260 гадамі. У гэты час ён напісаў таксама каментар да "Сентэцый" Пятра Ламбардскага, яшчэ адзін каментар да Баэцыя (*Expositio libri Boetii de Trinitati*), *De ente et essentia, De principiis naturae* і шэраг "Пытанняў" [1, с. 213].

Нягледзячы на тое, што рускамоўны пераклад *De Hebdomadibus* Баэцыя зроблены досыць даўно [2], каментар Тамаша не зацікавіў перакладчыкаў на ўсходнеславянскія мовы (існуюць, наколькі нам вядома, некалькі перакладаў на ангельскую, пераклад на французскую і італьянскую), таму ён амаль невядомы сярод славянамоўных даследчыкаў. Між тым, гэты каментар з'яўляецца значным для разумення не толькі анталогіі Тамаша, але і ўсёй тамісцкай метафізікі, асноўнай праблемай якой ёсць падзел паміж *быццём* (*esse*) і *існым* (*ens*). Няпоўнае разуменне гэтага падзелу, на думку вядомага неасхаласта Эцьена Жыльсана, не дае ўбачыць усёй поўні і арыгінальнасці думкі Тамаша, што вядзе адных даследчыкаў да сцверджання, што Аквінат толькі паўтарае Арыстоцеля, другіх — што ён нават і не здолеў яго правільна паўтарыць, трэціх — што ўся тамісцкая філязофія наогул ёсць толькі мазаікай з вычварных аскромкаў, запазычаных з розных вучэнняў [3, с. 149]. Дзеля таго, каб адэкватна зразумець і дакладна інтэрпрэтаваць тэкст Тамаша Аквінскага, неабходна, на наш позірк, выкарыстаць такія герменеўтычныя працэдуры, як 1) *вылучэнне аўтарскага сэнсу*, г. зн. сэнсу, які надае тэксту сам аўтар, 2) *прадметна–праблемнага сэнсу*, звязаннага з дотыкам да ісціны, і 3) сэнсу, які надае тэксту *чытач*.

Высвятленне *аўтарскага сэнсу* пачынаецца з вызначэння *мэты твору*, г. зн., з выяўлення таго, якое пытанне першапачаткова ставіў аўтар. Дзеля гэтага трэба акрэсліць традыцыйные ў яго час кола пытанняў і варыянты адказаў. У выпадку Тамаша — гэта дыскусія аб спецыфіцы дзейнасці законніка. Супярэчнікі Тамаша сцвяржалі, што сапраўдны законнік павінен займацца толькі фізічнай працай, у тый час,

як ён сам даводзіў, што фізічная праца мае другасны характар у параўнанні з разумовай — *выкладаннем* ці *чытаннем казанняў*, якія з'яўляюцца распаўсюджаннем ўнутранага сузірання (мэдытацыі). На думку Жыльсана, менавіта з выкладчыцкай працай ідэнтыфікаваў сябе сам Тамаш. Святы, тэолаг і містык, ён быў, перш–наперш, Доктарам, "вучоным Царквы" [3, с. 10], які прысвяціў сваё жыццё выкладанню. "Як хрысціянскі Доктар, ён з розных крыніц збіраў усё, што магло спрыяць наілепшаму выкананню задачы, якую ён паставіў перад сабой" [3, с. 15]. Дзеля гэтага ён і "чэрпаў" у Арыстоцеля, Прокла, св. Аўгустына, Ібн Сіны, Ібн Рушда і — у нашым выпадку — у Баэцыя. Ён вывучаў іх з адзінай мэтай — як мага лепей падрыхтаваць сваю хрысціянскую аудыторыю да ўспрымання слова Боскага.

Такім чынам, аўтарская мэта каментару *De Hebdomadibus* (*De substantiae bonae*) Баэцыя — выкарыстанне багацця думак філосафа дзеля ілюстрацыі хрысціянскіх ісцін. *De Hebdomadibus* (*De substantiae bonae*) Баэцыя прысвечаны праблеме існавання *добрых* (*bonus*) *субстанцый*, якія ў той жа час не з'яўляюцца *добрымі субстанцыянальна*. Баэцыус вырашае гэтую праблему праз супрацьпастаўленне паняццяў *esse* (*існавання*) і *id quod est* (*існуючага / таго, што існуе*). Рэчы могуць быць добрымі, паколькі яны вынікаюць з быцця, якое ёсць добрым. Але іхняя даброта не з'ўляецца тым жа самым, што і даброта самога быцця. Іхняя даброта звязана з дабротай самога быцця такім жа чынам, як *існуючае* з *быццём*. Да таго ж рэчы з'яўляюцца складанымі, і дзеля іх *існаваць* і *быць добрымі* — не адно і тое, і ніводнае з іх не звязана непасрэдна з іх існасцю. Дадзеныя ідэі Баэцыя з'яўляюцца дзеля Тамаша толькі зыходным пунктам. Абапіраючыся на іх, ён адказвае на ўласнае "аўтарскае пытанне".

Знешне *Expositio libri Boetii de Hebdomadibus* выглядае як звычайны схаластычны каментар — кожны фрагмэнт арыгінальнага тэксту Баэцыя суправаджаецца падрабязным тлумачэннем Тамаша. Але ўжо ўводзіны, якія з'яўляюцца інтэрпрэтацыяй цытаты з Бібліі *Praecurre prior in domum tuam, et illuc advocare et illic lude, et age conceptiones tuas* [*Увайдзі першым у дом свой і там засяродзься: і там гуляй, і там чыні развагі свае*] (Eccli. 32, 15—16.), адцягваюць нашу ўвагу ад ідэй Баэцыя. Тлумачачы гэтую цытату, Тамаш закранае праблему дасягнення вольнасці мыслення. Гэтым ён (магчыма, неўпрыкмет дзеля сябе самога?) змяшчае акцэнты на гнасеалагічную праблематыку. У самім каментары, канцэнтруючыся пераважна на другой частцы працы Баэцыя, Тамаш разглядае праблему размежавання паняццяў *esse* (*існавання*) і *id quod est* (*існуючага / таго, што існуе*) у кантэксце праблематыкі, больш

актуальнай дзеля яго самога. Дадзеная праблематыка звязана, як сказана вышэй, з вызначальным дзеля яго філасофіі падзелам паміж *esse* (*існаваннем*) і *ens* (*існым*).

Гэты падзел найдалей робіцца значным не толькі дзеля метафізікі, але і дзеля гнасеалогіі Тамаша, праз новы падзел паміж *esse* і *ens communi*, дзе ён паказвае межы чалавечага спазнання і рознасць метафізікі і теалогіі. На наш погляд, праблематыка *esse* і з'яўляецца *прадметна–праблемным* сэнсам твору, то бок адпавядае *існасці справы. Esse* разумеецца ў Тамаша як сам акт існавання, які прысутны ў кожнай рэчы, але ўсё адно цалкам не дасягальны дзеля нашага разумення. Мы можам спасцігнуць толькі *ens* — існае як індывідуальную субстанцыю, што мае існаванне (*esse habet*). Шматлікімі тлумачальнікамі Тамаша менавіта існае разумелася як галоўны спакмень, ці аб'ект, яго метафізікі. Такую інтэрпрэтацыю дапускае ў тым ліку і дадзеная праца.

Прадметна-праблемны, ці існасны, сэнс гэтай працы з'яўляецца неспасцігальным цалкам менавіта таму, што Тамаш і кажа ў ёй аб тых рэчах, што толькі часткова адчыненыя дзеля нашага спазнання. Існаванне з'яўляецца неперарыўным актам, і таму можа ўспрымацца нашым абмежаваным розумам толькі фрагмэнтарна, так жа, як і існаванне тэкста (і яго прачытанне) з'яўляецца няспынным працэсам, што выходзіць за межы індывідуальнай свядомасці. Такім чынам, нават сам аўтар паўстае перад намі як фігура другарадная ў параўнанні з тэкстам як такім. Калі ўжываць тэрміналогію самога Тамаша, ён надае тэксту толькі форму.

Такім чынам, наяўнасць прадметна–праблемнага сэнсу *Expositio libri Boetii de Hebdomadibus* дае тэксту выхады на больш шырокае кола праблем і пытанняў, чым першапачаткова планавалася аўтарам. Наўзверш аўтарскага сэнсу тэкст атрымлівае нешта, што дае яму магчымасць закранаць *існасць справы*. Наяўнасць пэўнай адлегласці паміж *аўтарскім* і *прадметна–праблемным сэнсам* дазваляе тэксту розным чынам актуалізавацца ў розныя гістарычныя эпохі, што і абумоўлівае наяўнасць *сэнсу чытача*.

Сэнс, які можа надаць сучасны чытач каментару Тамаша, актуальны ў наяўнай культурнай сытуацыі і звязаны з няпэўнасцю чалавечага спазнання. Папраўдзе, трэба адзначыць, што ісціна, якой намагаецца Тамаш ёсць адрознай ад таго, што разумеецца пад гэтым зараз. Дзеля яго адзінай ісцінай і сапраўднай мэтай філязофіі ёсць веды аб існаванні і аб Богу. Таму з абмежаванасці такога спазнання — якое ў Тамаша з'яўляецца вяршыняй усялякага теарэтызавання — можна вывесці, кажучы сучаснай мовай, канцэпцыю многасцівасці ісціны. Гэтую

актуальную ідэю можна выказаць і так: ніхто і ніщто, акрамя Бога, не можа прэтандаваць на валоданне ўсёй ісцінай. Менавіта гэтая ідэя дазваляе акцэнтаваць адрозненне паміж самой ісцінай і нашым яе тлумачэннем. Грунтуючыся на ідэях Тамаша, можна стварыць цалкам задавальняючую мадэль уласнага адказу як на сваеасаблівую амаральнасць сучаснага пазнавальнага плюралізму, так і на фанатызм дагматыкаў.

Такім чынам, герменеўтычная метадалёгія забяспечвае магчымасць шматпланавага чытання тэкста сярэднявечча. Не абмяжоўваючыся аўтарскім сэнсам тэксту і абапіраючыся на эмінентны прадметна-праблемны сэнс, магчыма перачытаць гэты каментар у свеце сучаснай праблематыкі, што робіць вывучэнне гэтага тэксту важлівым дзеля сучаснай філязоўскай традыцыі.

**Літаратура**


1. *Коплстон Ф. Ч.* История средневековой философии. Альберт Великий и Фома Аквинский. М.: Энигма, 1997.
2. *Боэций.* Каким образом субстанции могут быть благими, в силу того, что они существуют, не будучи благами субстанциальными: К Иоанну Диакону // Боэций. «Утешение философией» и другие трактаты. М.: Наука, 1990. С. 161—167.
3. *Жильсон Э.* Томизм. Введение в философию св. Ф. Аквинского // Жильсон Э. Избранное: Том 1. М. СПб.: Университетская книга, 2000.